ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта
А.В.Клімовіч
8 студзеня 2025 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку правядзення абласнога конкурсу праектаў патрыятычнай тэматыкі сярод раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці “Сильна Беларусь связью поколений”, прысвечанага 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу праектаў патрыятычнай тэматыкі сярод раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці “Сильна Беларусь связью поколений” (далей – абласны конкурс) у рамках святкавання 80-ай гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

2. Мэтамі абласнога конкурсу з’яўляюцца выяўленне, матэрыяльная падтрымка і папулярызацыя культурных праектаў патрыятычнай тэматыкі (далей – культурны праект).

3. Арганізатарамі абласнога конкурсу з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама і дзяржаўная ўстанова культуры “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (далей – ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”).

4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем абласнога конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый (Дадатак 1).

5. Абласны конкурс праводзіцца ў адзін этап у перыяд з 13 студзеня па 31 мая 2025 г. па наступных намінацыях:

“Лепшая культурна-відовішчная праграма патрыятычнай тэматыкі”. Згодна з артыкулам 213 Кодэкса аб культуры пад культурна-відовішчным мерапрыемствам разумеецца публічнае выкананне вынікаў творчай дзейнасці калектывамі мастацкай творчасці і (або) асобнымі выканаўцамі. Напрыклад, спектакль, канцэрт, прадстаўленне, фестываль, конкурс, канферэнцыя, форум, майстар-клас, пленэр, семінар і г.д. Праграмы дадзенай намінацыі могуць уключаць у сябе элементы вышэй пералічаных форм работы. Пераважна, ацэньвацца ў дадзенай намінацыі будзе сюжэтны ход правядзення праграмы, а не

толькі вакальныя дадзеныя выканаўцаў, напрыклад, для канцэртнай праграмы.

“Лепшы патрыятычны моладзевы праект”. Задачы праекта павінны быць накіраваны на патрыятычнае выхаванне моладзі: духоўна-маральнае, гісторыка-краязнаўчае, грамадзянска-патрыятычнае і г.д. Праект павінен уключаць у сябе правядзенне цыкла тэматычных мерапрыемстваў (акцыі, конкурсы, круглыя сталы, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, суботнікі, велапрабегі і інш.), якія будуць прадугледжваць прыцягненне падрастаючага пакалення да ўдзелу ў дзяржаўных святах Рэспублікі Беларусь, святкаванню значных для краіны маштабных падзей і юбілейных дат.

“Лепшы твор выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва”. Работы дадзенай намінацыі могуць быць выкананы ў тэхніцы: жывапісу, графікі, скульптуры, выцінанкі, ткацтва, аплікацыі, мастацкага роспісу і інш. у выглядзе карціны, масштабнага дэкаратыўнага пано, габелена.

6. У абласным конкурсе прымаюць удзел калектывы работнікаў раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці (у тым ліку, гарадскіх дамоў культуры, цэнтраў рамёстваў, устаноў культуры змешанага тыпу) Гродзенскай вобласці.

7. Культурныя праекты, прадстаўленыя ўдзельнікамі абласнога конкурсу, павінны адпавядаць наступным патрабаванням:

з’яўляцца творамі мастацтва ці культурнымі мерапрыемствамі, прысвечанымі гісторыі і культуры Беларусі, традыцыям, звычаям беларускага народа, важным падзеям сучаснага жыцця Беларусі, знакамітым суайчыннікам;

быць упершыню публічна абнародаванымі, выдадзенымі, апублікаванымі ў перыяд з 13 студзеня па 31 мая 2025 г.;

мець высокі прафесійны ўзровень;

вызначацца наватарствам і арыгінальнасцю ў раскрыцці патрыятычнай тэматыкі;

мець станоўчыя водгукі ў сродках масавай інфармацыі.

8. Для ўдзелу ў абласным конкурсе ўдзельнікі прадстаўляюць у ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8 да 1 жніўня 2025 г. уключна ў друкаваным (афармляюцца ў папку-партфоліа) і электронным выглядзе (на электронную пошту info@gromc.by з пазнакай “Патрыятычны праект”) наступныя матэрыялы:

8.1 заяўка (Дадатак 3);

8.2 відэазапіс культурнага праекта (для намінацый “Лепшая культурна-відовішчная праграма патрыятычнай тэматыкі”, “Лепшы патрыятычны моладзевы праект”) у электронным выглядзе, а

таксама афішы, праграмкі, буклеты, іншыя рэкламныя і інфармацыйныя матэрыялы культурных праектаў;

8.3 твор, а таксама фатаграфіі ў пячатным і ў электронным выглядзе (у фармаце JPEG, 300 dpi) і відэаматэрыялы працэсу стварэння твора (для намінацыі “Лепшы твор выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва”);

8.4 інфармацыю аб рэалізаваным культурным праекце, якая разам з іншымі звесткамі, павінна ўключаць яго апісанне, звесткі аб аўтары ці аўтарскім калектыве, звесткі аб абнародаванні культурнага праекта, пералік водгукаў у сродках масавай інфармацыі;

9. У перыяд да 1 верасня 2025 г. журы (Дадатак 2) ажыццяўляе разгляд конкурсных матэрыялаў.

10. Пры падвядзенні вынікаў абласнога конкурсу журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі адбору: выкананне ўмоў і патрабаванняў да культурнага праекта, уключаючы правілы афармлення і падачы (прадстаўлення) конкурсных матэрыялаў; адпаведнасць культурнага праекта прапанаванай тэматыцы; высокі мастацкі ўзровень зместу і выканання твораў мастацтва культурнага праекта; выкарыстанне арыгінальнага рашэння; абнародаванне культурнага праекта на канцэртах, выставах, у тэатрах, кінатэатрах, сродках масавай інфармацыі і іншым чынам; значнасць культурнага праекта для рэгіёна, колькасны склад удзельнікаў і аўдыторыі гледачоў.

11. Журы мае змяняць, вызначаць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду.

12. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

13. Па выніках абласнога конкурсу журы вызначае лаўрэатаў (I, II, III ступеняў) у кожнай намінацыі, якія ўзнагароджваюцца прызам і дыпломам у рамцы.

14. Дадаткова журы ўзнагароджвае пераможцаў дыпломамі і спецыяльнымі прызамі:

за лепшы сцэнарый культурна-відовішчнай праграмы “Под знаменем Победы”;

за лепшы відэа-ролік “Говорят свидетели войны”;

за лепшае рэжысёрскае рашэнне праекта “Победа в памяти поколений”;

за лепшае раскрыццё тэмы “День Победы в моей семье”;

за лепшы выраб дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Память наших сердец (история Победы в ремесле)”.

15. Астатнія ўдзельнікі абласнога конкурсу атрымліваюць дыпломы за ўдзел.

16. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў

абласнога конкурсу адбудзецца ў рамках святочных мерапрыемстваў, прысвечаных Дню народнага адзінства. Месца і дата будзе ўдакладнена кожнаму пераможцу індывідуальна.

17. Рашэнне членаў журы па выніках абласнога конкурсу фіксуецца ў пратаколе, які размяшчаецца на афіцыйным сайце ДУК "Гродзенскі АМЦНТ" не пазней 10 каляндарных дзён з моманту прыняцця рашэння журы абласнога конкурсу.

18. Фінансаванне Конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі АМЦНТ" на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

19. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: набыццё прызоў, спецыяльных прызоў, дыпломаў і рамак для дыпломаў.

20. Для фінансавання абласнога конкурсу на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

21. Аргкамітэт абласнога конкурсу пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу, а таксама перанос даты падвядзення вынікаў абласнога конкурсу (у іншыя тэрміны).

22. Арганізатары абласнога конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на распаўсюджванне інфармацыі аб конкурсных матэрыялах у інтэрнэт прасторы. За дадзеныя запісы ганарары аўтарам конкурсных матэрыялаў не выплачваюцца.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу праектаў патрыятычнай тэматыкі сярод раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці “Сильна Беларусь связью поколений”, прысвечанага 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога конкурсу праектаў патрыятычнай тэматыкі сярод раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці “Сильна Беларусь связью поколений”, прысвечанага 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта*; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта*; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Пракопчык В.Г. | загадчык аддзела ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пятрук А.П. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу праектаў патрыятычнай тэматыкі сярод раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці “Сильна Беларусь связью поколений”, прысвечанага 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне

# СКЛАД ЖУРЫ
абласнога конкурсу праектаў патрыятычнай тэматыкі
сярод раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці
“Сильна Беларусь связью поколений”, прысвечанага 80-годдзю
Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы*; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня журы;* |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *намеснік старшыні журы;* |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пракопчык В.Г. | загадчык аддзела ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пятрук А.П. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Барысевіч Я.А. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу праектаў патрыятычнай тэматыкі сярод раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці “Сильна Беларусь связью поколений”, прысвечанага 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектарам) культуры гар(рай)выканкама
“___” _____________ 2025 г.

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным конкурсе праектаў патрыятычнай тэматыкі сярод раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці “Сильна Беларусь связью поколений”, прысвечанага 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне

Звесткі аб удзельніку конкурсу:

1. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку аўтара (аўтараў) культурнага праекта, пасада, базавая ўстанова дзейнасці ў адпаведнасці са статутным дакументам, кантактныя звесткі (адрас месца працы, мабільны тэлефон, электронны адрас), які ажыццяўляе падачу конкурсных матэрыялаў для ўдзелу ў конкурсе (на беларускай і рускай мове)____________________________________________________________

2. Назва культурнага праекта________________________________________

3. Дата першага публічнага абнародвання культурнага праекта________

4. Да ўдзелу ў якой намінацыі вылучаецца___________________________

Кіраўнік установы _______________________
(подпіс)

Заяўкі на ўдзел у абласным конкурсе дасылаюцца да 1 жніўня 2025 г. на адрас: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, e-mail: info@gromc.by з пазнакай “Патрыятычны праект”. Кантактныя тэлефоны ў г. Гродна: +375 152 623801, тэл/факс +375 152 623788 .